тамі эстрадызацыі), дзе на галоўнае месца пастаўлены сцэнічная яркасць і дасяжнасць, аднак, захоўвая пры гэтым нацыянальны каларыт.

М.В.Няхай
(кафедры літаратуры)

## ЭВАЛЮЦЫЯ ГІСТАРЫЧНАГА РАМАНА У КАНТЭКСЦЕ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ ПРОЗЫ (40-50-я г.г.)

Пасляваеннае дзесяцігоддзе выступае ў ролі эпохі, якая звязвала даваенны перыяд з 60-мі гадамі, дзе сыходзяцца "канцы" папярэдняга і "пачатак" наступнага перыяду літаратурнага развіцця. У гэтыя гады энергія духоўнага абнаўлення, абумоўленая перамогай над фашызмам і радасцю мірнай працы, апладатварала літаратурны працэс, вызначала актыўнасць у стылявых пошуках. Найбольш прыкметна заяўляе аб сабе мастацка-дакументальная проза, раман аб вайне, у прыватнасці, партызанскі раман, раман аб вёсцы, "вытворчы" раман. Аб пасляваенным часе даводзіцца гаварыць як аб часе "раманаманіі". У 40-50-я гады галоўная ўвага была сканцэнтравана на распрацоўцы рамана панарамнага тыпу. Цяга да рамана-эпапеі, якому ў 50-я гады даводзілася асаблівая роля ў ідэалагічнай барацьбе, узмацняла цікавасць да цыклічных форм, таму што менавіта так - як справа памеру, паўнаты адлюстравання падзей - разумеўся прынцып эпапейнасці. Зноў як вызначальнае для эпаса праяўляе сябе падзейны пачатак. Стала модным напісанне дылогій, трылогій, тэтралогій, пенталогій. Быў створаны іх культ. Але ж раманнае мысленне не стаіць у прамой залежнасці ад ліку тамоў. Паўставала складаная праблема - ці з'яўляецца колькасць заменай сапраўднай шырыні. Прэваліраваў "аўтарытарны" прынцып, сутнасць якога дакладна сфармуліраваў У.Такерэй - "аўтар ведае усё". Стылевы пошук у літаратуры на працяглы час быў прыпынены, у супрацьвагу яму усё больш непадзельна пачынае сцвярджацца стылявая аднастайнасць, звязаная з функцыяніраваннем так званага "нейтральнага" стылю. Дамініруе вялікі мануметальны эпічны стыль, які яхіляецца да "панарамнага рамана". А тэарэтыкі таго

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

часу неправамерна стараліся усе гэта загрыміраваць пад "народную эпапею" ("Векапомныя дні" М.Лынькова, "Святло над Ліпскам" М.Паслядовіча, "Пад мірным небам" і "Шырокія гарызонты" А.Стаховіча, "У агні" І.Гурскага, "Гартаванне" А.Кулакоўскага, "Згуртаванасць" М.Ткачова і інш.). Але ўзнікшая пэўная мода пісаць тоўстыя, "пульхныя" раманы нарадзіла адначасова і недавер да іх. Ужо ў канцы 50-х гадоў пачалі наносіцца сакрушальныя ўдары па перажытках вульгарнага сацыялагізму, ішла барацьба супраць разнастайных відаў фальшу, напрыклад, супраць існавання ідэальнага героя, што было справядліва ацэнена як рэцэдыў толькі што развенчанай тэорыі бесканфліктнасці. Далекая ад рэальнай рэчаіснасці, яна наносіла адчувальную шкоду літаратуры. У час жа панавання ўсяляк адабралася аблегчанае раскрыццё цяжкасцей і недахопаў пасляваеннага будаўніцтва, у моду ўвайшло штучнае вырашэнне складаных жыццевых спраў і грамадскіх калізій, адмаўлялася наяўнасць у сацыялістычным грамадстве ўсялякіх канфліктаў і супярэчнасцей, апрача адлюстравання канфлікта паміж "лепшым" і "проста добрым", паказу барацьбы паміж выдатным і добрым, цудоўным і добрым. Успамінаючы гэтую праславутую тэорыю, якая ў пасляваенныя гады разгарнулася ваўсю і заклікала да лакіроўкі і прыхарошвання жыцця, узнікае пытанне, ці быў літаратурны густ у тых, хто захапляўся творамі аб канфліктах добрага героя і яшчэ больш лепшага? Падвяргаліся крытыцы і іншыя вынікі ілюзорнасці і лакіроўкі, якія з цяжкасцю зжываліся ў нашым мастацтве. Сумна бывае, калі яго героі пазбаўлены абаяння, маштабнасці характараў, сярод ўсеагульнай статычнасці ніхто не спрабуе перадаць тонкую партытуру руху зменлівай чалавечай душы. У творах панавалі наіўнасць шматлікіх жыццевых сітуацый, дэкларатыўнасць і парадансць, пампезнасць, старанная, дбайная, руплівая ідэалізацыя, спрошчанасць развязкі канфлікта, рэзанёрскі павучальны фінал, празмерная палітызацыя, якія заглушалі сапраўдныя творчыя пошукі. Ставілі літаратуру пад самы жорсткі партыйны кантроль, дырэктыўныя указанні другой палавіны 40-х гадоў і наступнага часу. Усе, што не укладвалася ў партыйныя прадпісанні, аб'яўлялася шкодным, тым што ганьбуе, зневажае высокае званне савецкага пісьменніка. Трывожнай станавілася і агульная атмасфера ў грамадстве, зноў адчувалася крывавае дыханне культаўскіх 30-х гадоў. Сталі больш жорст-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кімі санкцыі і рэпрэсіі, прымаліся адвольныя пастановы ў галіне літаратуры і мастацтва. Часцей за ўсе здаралася так, што ў літаратуры аналіз грамадскіх падзей падмяняўся ілюстрацыяй, уяўнай актуальнасцю, што шкодзіла праўдзіва-усебаковаму адлюстраванню жыцця. У творах, якія паявіліся пасля вайны і былі прысвечаны асвятленню праблем сучаснасці, прыкметна выявілася тэндэнцыя "прыўздымання" рэчаіснасці, штучнага яе ўзвялічэння ("Жніво" Г.Нікалаевай, "Плывучая станіца" В.Закруткіна, "У нас ужо раніца" А.Чакоўскага, "Ясны бераг" В.Пановай, "Жывая вада" В.Кажэўнікава, "Ад усяго сэрца" Я.Мальцава, "Кавалер Залатой Зоркі" і "Святло над зямлей" С.Бабаеўскага і інш.). Бясспрэчна, такія аптымістычныя настроі таксама мелі пад сабой жыццевую глебу. Найвялікшая радасць, якой былі ахоплены савецкія людзі ў выніку перамогі над звярыным фашысцкім светам, дазваляла, нават прымушала пісьменнікаў не заўважаць тых недахопаў і супярэчнасцей, якія назіраліся ў сваім "лагеры". Але паступова такія адносіны да жыцця ператварыліся ў шаблон, сталі абавязковай мерай маральнага стану. Скрозь назіраўся спрошчаны падыход да вырашэння канфліктаў, а гэта прыводзіла да таго, што і вобразы людзей атрымоўваліся нежыццевымі, схематычнымі. Лакіроўка і параднасць дасягалі такіх памераў, што героі раманаў ператвараліся ў "службовыя" фігуры, закліканыя толькі ілюстраваць тыя ці іншыя тэзісы і пазбаўленыя ўнутранага развіцця і неабходнасці пераадольваць супярэчнасці. Клапатлівая рука аўтара ўбірала усе цяжкасці з дарогі героя, у выніку ў яго проста не было магчымасці праявіць свой характар і яму заставалася толькі вымаўляць "правільныя" прамовы. Укаранілася ў практыку пісьменнікаў трактоўка цемных бакоў суровай рэчаіснасці ў рамках абмежаванага крытыцызму ўсяго толькі як перажыткаў мінулага, крытыка асобных недахопаў у "самым дасканалым грамадстве", крытыка, якая не закранала сапраўдных каранёў з'явы. Узмоцнена прапагандуецца сацыялізм як афіцыйная дактрына правячага класа. Прадпісаны аптымізм патрабаваў ад пісьменніка такога адлюстравання чалавека, якое пры ўсіх перыпетыях рэчаіснасці, пры ўсіх паражэннях і нават смерці героя даводзіла б думку аб непазбежнасці перамогі сацыялізма, які ідэнтыфіцыраваўся з дабром, прыгажосцю і высокай мараллю. Мастацкая і ідэйная слабасць літаратурных твораў савецкіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аўтараў, нерэалістычнасць шматлікіх з іх выявілася ў тым, што ў іх не вытлумачвалася аб'ёмна і шматбакова непазбежнасць перамог савецкага народа і арміі. Пісьменнікі шукалі адзіную прычыну і непаладак у калгасным жыцці не ў агульных недахопах сістэмы, а ў асабістых якасцях і недаробках асобных людзей. Зусім ігнараваліся агульначалавечыя пачаткі, ішло адмаўленне агульначалавечай маралі, вечных ісцін, гуманістычных каштоўнасцей. Дамініруюць калізіі, звязаныя з класавай барацьбой, сацыяльнымі праблемамі інтэлігенцыі, з жудасным становішчам прыгнечанага цяжкай, непасільнай працай "несацыялістычнага" народа (для "сацыялістычнага" ж народа праца - гэта радасць, лікаванне і свята), усе прыпадносіцца ў святле новай канцэпцыі станоўчага і адмоўнага героя. Паступова пачыналася і эрозія падобнай трактоўкі аптымізма і паслабленне рэгламентацыі, заўважаўся разрыў прамой сувязі і прамой ідэнтыфікацыі паміж адлюстраваннем барацьбы дабра са злом, супрацьстаянне прыгажосці з агіднасцю і маралі з заганамі. Цяжка было захаваць абавязковую увязку "станоўчага" героя з сацыялістычнымі ідэаламі, хоць адступацца ад гэтага афіцыйна не дазвалялася і не дапускалася.

Але ці можна лічыць штучную эпізацыю прозы ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе прыкметай разбурэння тых формаў эпічнасці, якія склаліся ў рамане раней? Новы час нараджаў новага героя, і на гэтай аснове адбывалася абнаўленне жанра. Назіраліся нязначныя змены і ў адносінах пісьменнікаў да гісторыі, якія праявіліся ў рамках стэрэатыпаў і канонаў сацрэалізма і ідэалогіі, закладзенай у яго аснову. Паявіліся незакончаны раман Я.Брыля "Граніца" (1949) і яго аповесці "У Забалоцці днее" (1951), "На Быстранцы" (1955), сацыяльна-псіхалагічны раман-хроніка П.Пестрака "Сустрэнемся на барыкадах" (1954), раманы І.П.Шамякіна, І.Мележа, М.Лынькова, раман А.Чарнышэвіча "Світанне" (1957), якія ў параўнанні з апошнімі перадваеннымі раманамі "Будучыня" (1938) Э.Самуйлёнка, "Сэлаўі святога Палікара" (1939) Р.Мурашкі, "Паўстанне" (1940) М.Пасляковіча былі крокам наперад у мастацкім асваенні рэчаіснасці. Героі першых пасляваенных твораў не з'яўляюцца гістарычнымі асобамі ў дакладным сэнсе слова. Але ўжо прасочваецца ўзнікненне гістарычных раманаў, у цэнтры якіх стаяць вядомыя ў гісторыі беларускія нацыянальныя героі. Яны ў поўнай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

неры выразілі імкненне свайго народа, яго дарэвалюцыйныя лёсы, лёсы сялян пасля грамадзянскай вайны, лёсы заходніх беларусаў, паказалі настроі людзей, якія жылі на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Яны дастаткова звязаны з працэсамі грамадскай барацьбы дарэвалюцыйнай эпохі, уяўляюць сабой тыповыя абагульненні вобразаў людзей свайго часу (Андрэй Касцевіч, Алесь Марыніч, Уладзімір Грамыка і інш.). У 1954 годзе была завершана трылогія Якуба Коласа "На ростанях", якая набыла статус рамана. Герой яе настаўнік Андрэй Лабановіч праходзіць шлях ад ціхага асветніцтва да ўдзелу ў арганізацыі беларускага настаўніцкага з'езду. За гэта ён быў падвергнуты палітычным рэпрэсіям, у час адбывання пакарання сутыкнуўся з бальшавіцкай ідэалогіяй.

У пасляваенныя гады былі спробы звароту непасрэдна да гістарычнай тэмы ў Я.Дылы (незавершаны раман "На шляху з варагаў у грэкі", 1945), М.Садковіча ("Аповесць аб лёсе Стахоры",1950), І.Клаза (аповесці "Жарцы", 1955, "Падснежнікі", 1958, "Прасталюдзін з Крычава", 1959). Але, на жаль, усе гэта не магло прывесці да ўзнікнення гістарычнага рамана. Асаблівасці гэтага феномена можна вытлумачыць і тым, што пісьменнікі яшчэ не сумелі ў той час зліць жанравыя рысы сусветна вядомага рамантычнага рамана падарожжаў, абласніцкага рамана нораваў і сацыяльнага рэалістычнага рамана, рамана "сацыяльна-маральнай адысеі" з традыцыямі асветніцкага рамана, прайсці праз сентыментальна-павучальную "вясковую" прозу да псіхалагічнай мадэлі рамана, створанага пазней І.Мележам і У.Караткевічам. Але неабходнасць гістарычнага рамана ў канцы 40-х – пачатку 50-х гадоў, калі тон задавала афіцыйная літаратура, не пазбаўленая шэрасці, безаблічнасці, рытарычнай трэскатні, кан'юнктуры і кампліментарнасці, адчувалася вельмі востра. Асабліва ў гады, калі краіна развітвалася паступова з холадам і лядзяной пяткай сталінскай спадчыны, а ў літаратуры нараслалі матывы трагічнага гуманізму. Новыя павевы, новыя спадзяванні ў асваенні мінулай гісторыі ўзніклі пад уздзеяннем ажыўлення мастацкага пульсу краіны, які вызначаўся правядзеннем такіх мерапрыемстваў, як другі з'езд савецкіх пісьменнікаў (1954), XX з'езд КПСС (1956). Адкрывалася новая эпоха ў развіцці савецкага грамадства, па-новаму апэнываліся шматлікія з'явы і тэндэнцыі мастацкай літаратуры, яе гістарызму і гістарычнасці.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ